# УСЕ НА ВЫБАРЫ!

№ 8 (439)

Субота, 18 сакавіка 1961 г.

Цана 1 кап.

Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!

# Беларускі ўніверсітэт

Орган парткома, рэктарата, мясцкома, камітэта ЛКСМБ і прафкома Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна




Фотаплакат М. ШОБЫ.

## Па універсітэту

### Памяці Т. Р. Шаўчэнкі

Зачараваная зала заціхла. У глыбіні сцэны, на фоне чырвонага аксаміту, у жывых кветках—знаёмы партрэт. Добрыя, разумныя вочы. Напружана зведзены бровы. Тарас Шаўчэнка задумаўся. І тут самі па сабе прыходзяць словы вялікага кабзара:

Думы мои, думы мои,
Горе, думы, с вами.
Что вы встали на бумаге
Хмурыми рядами?

Юбілейны вечар, прысвечаны 100-годдзю з дня смерці Т. Р Шаўчэнкі, прайшоў з поспехам. Пасля ўрачыстай часткі перад сабраўшыміся выступілі студэнты і госці—артысты тэатра юнага гледача, Белдзяржфілармоніі і тэатра оперы і балету, выхаванцы дзіцячага дома № 8.

Усім спадабаліся раманс Рахманінава на словы Т. Шаўчэнкі «Полюбила я», а таксама ўкраінская народная песня «Соловейко» у выкананні салісткі Белдзяржфілармоніі Т. Лук'янавай. Урывак з паэмы Шаўчэнкі «Кацярына» прачытала артыстка тэатра юнага гледача М. Міцкевіч.

Закончыўся канцэрт выступленнем самага маладога пакалення сабраўшыхся тут нашчадкаў паэта—выхаванцаў дзіцячага дома № 8. Зала была ўзрушана непасрэднасцю і талентам юных артыстаў, аб шчасці якіх сто гадоў назад думаў вялікі ўкраінскі паэт.

Д. ДАБРЫЯНІК.



У гасцях у студэнтаў універсітэта пабывалі галоўны рэдактар часопіса «Огонёк» Анатоль Уладзіміравіч Сафронаў і яго намеснік Барыс Уладзіміравіч Іваноў.

Беларускі пісьменнік Іван Шамякін расказаў аб грамадскай і літаратурнай дзейнасці Анатоля Уладзіміравіча. А калі студэнты даведаліся, што А. У. Сафронаў нарадзіўся ў Мінску, яны горача віталі свайго земляка.

Студэнты А. Шыловіч, Я. Ляхаў, А. Шлег, малады паэт Ул. Паўлаў, пісьменнік Іван Науменка падзяліліся сваімі думкамі аб часопісе, выказалі свае заўвагі.

Маскоўскі госць расказаў аб рабоце рэдакцыі часопіса, аб паездках па розных краінах свету.

**На здымку:** А. У. Сафронаў гутарыць са студэнтамі.
Тэкст **Я. Пракоп'ева.** Фота **В. Жураўлёва.**

## „МЫ З ТАБОЮ, КУБА!"

*Днямі пад такім дэвізам у студыі Беларускага радыёвяшчання праводзіўся вечар, арганізаваны студэнтамі БДУ—членамі клуба інтэрнацыянальнай дружбы. Ініцыятыву студэнтаў актыўна падтрымала рэдакцыя маладзёжнага радыёвяшчання.*

*Сваімі ўражаннямі аб сустрэчы з Фідэлем Кастра падзяліўся з прысутнымі рэдактар часопіса «Камуніст Беларусі» таварыш Качан—прадстаўнік дэлегацыі БССР на XV сесіі Генеральнай Асамблеі ААН. Тав. Качан расказаў таксама аб геранчнай барацьбе кубінскага народа.*

*На вечары студэнты выконвалі кубінскія песні, чыталі вершы кубінскіх і савецкіх паэтаў аб Кубе. Была праведзена цікавая віктарына «Што ты ведаеш аб Кубе?»*

*Вечар прайшоў цікава. Добры пачатак членаў клуба трэба падтрымліваць і надалей.*

### ПЕРШЫ ВЫХАД

*Прыемна пахне зямля, якая толькі што вызвалілася з пад снегу. Дзе-ні-дзе ў кустах, на касагорах ён яшчэ не ўспеў растаць. Адчуваецца прастор, свежасць і бадзёрасць. Цудоўна паблукаць такой ранняй вясной за горадам!*

*Мінулай нядзеляй турысты ўніверсітэта зрабілі першы выхад у новым сезоне за ваколіцы Мінска. Звыш пяцідзесяці чалавек прынялі ў ім удзел. Жарты, песні, смех не змаўкалі ўсю дарогу. А як прыемна ўспомніць ля кастра аб мінулых зімовых паходах! Усяго шэсць гадзін, праведзеных за горадам, далі бадзёрасці столькі, што, здаецца, на цэлы месяц хопіць.*

В. МАМАНТАВА,
студэнтка II-га курса фізфака.

### НОВЫ НУМАР «ЖУРНАЛІСТА»

Адначасова з нашай газетай у друкарні вярстаўся чарговы нумар газеты «Журналіст», які выпускаюць студэнты чацвёртага курса аддзялення журналістыкі пад кіраўніцтвам дацэнта М. С. Зярніцкага.

У газеце змешчаны цікавыя матэрыялы, прысвечаныя выбарам у мясцовыя Саветы. Сёння чытачы атрымаюць свежы нумар «Журналіста».

### ДА 90-годдзя ПАРЫЖСКАЙ КАМУНЫ

90 год таму назад—18 сакавіка 1871 года працоўныя Парыжа, узняўшыся на ўзброенае паўстанне, звергнулі ўладу буржуазіі і ўпершыню ў гісторыі стварылі пралетарскі ўрад. Гэтай знамянальнай падзеі прысвечана выстаўка, арганізаваная ў корпусе гуманітарных факультэтаў. На ёй экспаніруюцца творы класікаў марксізма-ленінізма аб Парыжскай камуне, працы савецкіх вучоных, артыкулы і іншыя матэрыялы, прысвечаныя гераічнай барацьбе парыжскіх пралетарыяў.

На конкурс

## ПЕСНЯ

НАРЫС

*Калі Панёў дабег да парта, тральшчык «Судак» даваў развітальны сігнал. Уладзімір ледзь паспеў пераскочыць па трапу на палубу, як судно адшвартавалася. Капітан судна Іван Сцяпанавіч Хлапкоў падаў у рупар кароткую каманду: «Самы малы ўперад!». «Судак» здрыгануўся ўсім корпусам і пачаў паволі адыходзіць ад прычала. Капітан падкруціў сівы вус, зняў выцвіўшую ад вятроў і сонца мічманку, хрыпла сказаў:*

*— Прывітанне, студэнт! Колькі гадоў мы з табой не бачыліся? Дык давай абдымемся, ці што?*

*Каманда судна са здзіўленнем глядзела на чубатага юнака ў элегантным гарадскім гарнітуры, якога моцна. абдымаў капітан. Той-сёй іранічна пагдядваў на модны гальштук засаромеўшагася юнака. Вочы ўсіх нібы казалі: адкуль гэты хлапец? Што яму рабіць тут, сярод нас? І, нібы зразумеўшы гэта, капітан прамовіў:*

*— Таварышы, знаёмцеся! Гэта наш новы рулявы Уладзімір Панёў. Пяць год таму назад ён лічыўся сярод нашых рыбакоў лепшым рулявым.—Памаўчаў, зноў падкруціў вус, дадаў:—І каб мне тут ніякіх жартаў! Панёў са мной да арміі тры гады на лоў хадзіў. Цяпер ён студэнт Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. Перад вамі, хлопцы, будучы журналіст стаіць. Дзяржыце з ім вуха востра, бо распясочыць ушчэнт. Іхняму брату ў рот пальцы не кладзі.—Капітан нацягнуў на самыя вочы мічманку, грымнуў нечакана:—Усім на месца! Падрыхтавацца да вахты!*

*Уладзімір з хваляваннем сціснуў рукамі кола штурвала. Хлапкоў аддаваў кароткія загады і тут жа краем вока сачыў за компасам. Тральшчык ішоў вызначаным курсам. Праз гадзіну Хлапкоў задаволена ляпнуў Уладзіміра па плячы, сказаў:*

*— Малайчына! Так трымаць, студэнт!—Усміхнуўся, закурыў:—Ну, а цяпер давай расказвай аб вучобе! Ты ўжо на якім курсе? На другі перайшоў? Добра! А фотаапарат навошта ўзяў? Людзей здымаць за працай? Давай, не пярэчу. Справа гэта патрэбная...*

*Тральшчык выходзіў у адкрытае мора. Яно дыхала цяжка і грозна. Велічна, нехаця, каціліся валы. Яны набягалі аднекуль з-за небасхілаў спакойна і павольна.*

*Пацягнуў вецер з норда. Хвалі зашумелі, паскорылі свой бег. Грэбні іх перакрыліся мыльнай пенай. Насіліся над морам чайкі. Кідаліся ў ваду, узрадавана ўскрыквалі і раптам шугалі ўгору з рыбкай у дзюбе. На іх накідваліся больш лянівыя, якім праца лаўца не дужа падабалася. Белы клубок з крылаў доўга трапечацца над таропкай хваляй. Нечакана прагны гам птушак перапалохана сціхае. Знясіленная барацьбой чайка кідае рыбу ў мора. Цішыня.*

*А мора ўсё дыхае цяжка і стомленна. Хвалі глуха таўкуцца ў борт судна. Ледзь уздрыгвае палуба ад мернага пульсу машыны. Вільготны вецер тонка насвіствае ў ванты, калмаціць пасмы валасоў у матросаў. І раптам над палубай, над сіва-зялёнымі хвалямі ўзнікае песня:*

*Ты уехала в знойные степи,*
*Я ушел на разведку в тайгу.*
*Над тобою*
*палящее знойное солнце,*
*Надо мною лишь кедры*
*в снегу...*

*На палубе здзіўлена ўскінулі галовы. Песня неслася з капітанскага мосціка. Яе спяваў новы рулявы. Рукі яго ляжалі на штурвале, вочы пільна глядзелі ўперад. А песня лілася, ляцела птушкай. Замёр капітан, застылі матросы на палубе.*

*А путь твой далёк и долог*
*И нельзя повернуть нам*
*назад.*
*Держись, геолог! Крепись,*
*геолог!*
*Ты ветра и солнца брат...*

(Заканчэнне на 2 стар.)

# ПЕСНЯ

(Пачатак на 1 стар.)

*Хтосьці з матросаў падцягнуў, і задушэўная мелодыя палілася над бясконцымі прасторамі мора.*

*Вечарэла. Чырвоны шар сонца каціўся за гарызонт. Вось яго дыск дакрануўся да небасхіла, і яно патанула ў пацямнеўшых хвалях Балтыкі, але яшчэ доўга сонечныя вейкі ззялі на небасхіле. Наступіла ноч. Спалі чайкі, гойдаючыся на хвалях. Лягла адпачыць каманда. Адзін толькі чалавек не спаў на судне. Гэта быў рулявы, пільны вартаўнік мора...*

*Паўтара месяца не пакідаў палубу Уладзімір. Днём і ноччу неабсяжнае і бясконцае мора, устрывожаны крык чаек, напружаная праца і песні, якія прывёз з Мінска. Песні яго ведала ўжо ўся каманда і пад неразлучную матроскую гітару спявала хорам ў часы адпачынку.*

*Нялёгка даводзілася працаўнікам мора. Па трое-чацвёра сутак іншы раз не змыкалі вачэй. Мора паважае працавітых. Толькі ім яно аддае належную даніну.*

*Калі «Судак» запоўніў рыбай усе трумы і ўзяў курс на Вентспілс, на яго абрушыўся шторм. Па палубе разнеслася трывожная каманда:*

*— Усім наверх! Мацаваць палубныя прыстасаванні! Задраіць трумы!*

*Гэта была жудасная ноч. Шкваламі налятаў цяжкі, пранізлівы вецер. Стыхія быццам звар'яцела. Жалобна енчыла антэна, гудзелі ванты. Вакол была непраглядная цемра. Нават пражэктар з капітанскага масціка не мог прабіць гэтую чорную бездань. Яго кінжал-промень адразу губляўся за носам карабля. «Судак» упарта поўз уперад. У эфір паляцела радыёграма: «Я «Судак». Знаходжуся ў дваццатым квадраце. Шторм — дзевяць балаў. Змагаемся!»*

*Каманда апранула выратавальныя паясы. Калі «Судак» узпаў на грэбень хвалі, агаляўся вінт. Трашчала абшыўка, на хісткай палубе не паспявала гаснуць пена. І раптам нейчы крык:*

*— З правага борта сарвала трал!*

*Усе аслупянелі. Капронавы дарагастаячы трал, які павесілі сушыць на вантах, абарвала магутнай хваляй. Нейкім цудам ён зачапіўся за крук на фальшборце. У цемры недзе насоўваўся наступны, самы жудасны, дзевяты вал. Ён змые трал за борт. І раптам нейчая высокая постаць шыбанула да барта, дабегла да трала і пачала ліхаманкава абвязваць яго вакол вантаў.*

*— Валодзя-а-а! Назад!—данеслася з масціка хрыплая каманда Хлапкова. Але юнак упарта працягваў сваю працу. Грозны вал ужо побач. Уладзімір чуе за спіной яго раз'юшаны гул. «Не паспею!—мільганула жудасная думка. — Хутчэй, хутчэй!»*

*— Наза-а-ад!—зноў данеслася аднекуль каманда Хлапкова. Уладзімір азірнуўся. Гіганцкі вал, нібы страшэнны чорны грыб, уздымаўся над носам судна.*

*Уладзімір бразнуўся на палубу, абхапіў мёртвай хваткай кнехт. У тое ж імгненне нешта балюча ударыла ў спіну, аглушыла. Губляючы прытомнасць, ён адчуў, што нейкая невядомая сіла пацягнула яго ўверх, але трал стаў на абарону свайго выратавальніка. Калі хваля схлынула, на палубе нерухома ляжаў юнак... Быў выратаваны і трал.*

*Праз некалькі дзён «Судак» уваходзіў у Вентспілс. Ззяла сонца, па-ранейшаму радасна крычалі чайкі. І раптам над паверхняю мора ўзнікла знаёмая песня:*

*Лучше друга нигде*
*не найду я,*
*Мы геологи оба с тобой.*
*Мы умеем и в жизни руду*
*дорогую*
*Отличить от породы пустой...*

*За штурвалам стаяў Уладзімір. З-пад зюйдвесткі, на якой блішчэлі кропелькі солі, смяяўся абветраны твар.*

*Будь отважен, мой друг,*
*и спокоен,*
*Не ищи проторенных путей!*
*Закаленная ветром и стужей,*
*и зноем*
*Только крепче любовь*
*и сильней...*

*Прыпеў падхапіла каманда. Загрукатаў якарны шпіль, і цяжкі якар пляснуўся ў ваду. Вечарам стала вядома ўсяму рыбнаму флоту Балтыкі, што тральшчык «Судак» выканаў свой план на 260 працэнтаў!*

*Тыдзень Уладзімір адпачываў у бацькоў, а потым зноў паклаў у кішэню заліковую кніжку і накіраваўся на вакзал. Яго праважалі матросы—сябры з каманды «Судака».*

*— Ну, што ты прывёз нам з Балтыкі?—жартаўліва пацікавіўся аднакурснік Уладзіміра Алесь Рыбак.*

*— Вось што,—і Уладзімір паднёс да яго твару агрубеўшыя ад працы рукі.*

*Прайшло паўгода. Уладзімір пасталеў, ажаніўся. Нядаўна ў яго быў урачысты дзень—Панёва прынялі ў партыю. Адначасова ён з'яўляецца намеснікам сакратара камсамольскай арганізацыі аддзялення журналістыкі. Дзе б ні паяўляўся Уладзімір, там узнікаюць жарты, смех. І зноў, як некалі на Балтыцы, гучыць вясёлая задушэўная песня—аб геолагах. Яе спявае Уладзімір Панёў, добры таварыш, студэнт, грамадскі работнік.*

Аляксандр ШЛЕГ.

*Виктор ВЕБЕР*

## У братской могилы

У могилы седая, в морщинах,
Неподвижна и скорби полна
Мать склонилась. Венок
для сына
Маков красных кладёт она.

Эти маки сама растила,
Берегла их с утра
до темна.
Как за сыном, за ними
ходила.
Сына взяла у нее война.

И, казалось, у братской могилы
Рядом встали с венками,
как кровь,
Все скорбящие матери мира...
Нет, войне не вернуться вновь!

Перевод с немецкого
А. НОВИК,
студентки 2 курса
отд. журналистики.

*СПОРТ*

## КАРАЛЕВА ВЫХОДЗІЦЬ НА СТАРТ

РЭПАРТАЖ

Стадыён «Дынама». Раніца. Шэры туман павіс над дрэвамі, над будынкамі. Марасіць дождждык. Але лёгкаатлетам Гаўрычэнка, Ксянзенка, Барадачу, Говіну, Меер і іншым гэта не перашкода. Сёння у іх трэніроўка па бегу. Задача нялёгкая: на працягу 30 мінут прабегаць некалькі разоў па 100 метраў з пераменнай хуткасцю, затым 10 разоў па 100 метраў на хуткасць і нарэшце—тысяча бегавых прыжкоў. Гэта для бегуноў на сярэднія дыстанцыі. Круг за кругам прабягаюць яны. Уважліва сочыць за бегам трэнер лёгкаатлетычнай секцыі майстар спорту Кушняроў. Чулы і патрабавальны выхавацель, ён шмат увагі ўдзяляе рабоце секцыі. Аб сваім трэнеру з любоўю гавораць спартсмены.

У яго ў руках секундамер. Вось да Кушнярова падбягае спартсмен. «Усё, хопіць на сёння»,—гаворыць ён. Трэнер прапаноўвае крыху перадахнуць і зноў прадаўжаць трэніроўку. І правільна робіць! Як неабходна іншы раз бегуну сіла волі, калі да фініша застаецца ўсяго некалькі метраў, а сіл—вельмі мала. Вось тут і праяўляецца тая цудоўная якасць спартсмена, якая завецца сілай волі, а выхоўваецца яна на трэніроўках.

Другі раз з трэнерам я сустрэўся ў спартыўнай зале. Ён ахвотна расказаў аб рабоце секцыі: «Трэніруюцца спартсмены пяць разоў у нядзелю. На панядзелак—гульні з мячом, ў аўторак і пятніцу—бег на стадыёне, у суботу—крос на працягу паўтары гадзіны, у сераду ў нас, у асноўным, дзень адпачынку». Але мне хутка прыйшлося быць сведкай, як лёгкаатлеты «адпачываюць» у гэты дзень. Пасля размінкі спартсмены прыбягаюць у залу. Праходзіць хвіліна, другая і ўжо здымаюць кругі цяжкай штангі. Трэнер дае указанні: «Будзем выконваць прысяданні са штангай».

Крыху ў баку трэніруецца рослая, белавалосая дзяўчына. Гэта Марыя Лаўніковіч з чацвёртага курса хімфака, першаразрадніца па бегу на 800 метраў, член зборнай БССР па лёгкай атлетыцы.

Побач з праслаўленымі майстрамі спорту Гараевым, Котавым, у секцыі займаюцца выдатнік вучобы Базылеў з гістфака, першаразрадніца Андрэйчык з таго ж факультэта. Марыя Верамейчык, студэнтка філфака, рыхтуецца сёлета стаць майстрам спорту.

Цікава ведаць, што ў секцыі займаюцца спортам 72 спартсмены. З іх два майстры спорту, 7 першаразраднікаў, больш 20 спартсменаў другога разраду. І ўсё ж малавата, патрэбна больш.

— Абавязкова напішыце ў газету яшчэ аб адным,—просіць ён.—Многія лічаць, што заняткі спортам—гэта не нагрузка. А ў самай справе гэта вельмі вялікая нагрузка. Спартсмен жа трэніруецца не толькі для сябе, а ў першую чаргу, каб абараняць спартыўны гонар свайго калектыву. З гэтым патрэбна лічыцца. Сёлетні сезон будзе напружаным. Вядучыя спартсмены будуць удзельнічаць у 25 спартыўных мерапрыемствах, усе астатнія члены секцыі—у 10. Мы спадзяёмся займаць толькі прызавыя месцы.

Што ж, вясна ідзе! Хутка «каралева спорту» выйдзе на старт. Шчаслівага фінішу вам, сябры!

Н. ШАРУБА.



На спатканне... Фота В. АНЦЫФЕРАВА.

Вечаслаў КАПЦІЛОВІЧ

## Сярод шумлівых лясоў і азёр

*З ДЗЕННІКА ТУРЫСТА*

(Пачатак у №№ 5—7)

*29 студзеня.*

*Сонечны дзень. Стаіць марознае надвор'е. Кругом лес, сярод якога блішчыць ледзяная гладзь азёр. Як цудоўна ісці на лыжах сярод такога хараства! Сустракаюцца паляўнічыя з ражкамі і дубальтоўкамі. Сёння выхадны дзень і аматары палявання з усіх акружаючых сёл робяць аблаву на ваўкоў.*

*Непрыметна адмахалі дваццаць кіламетраў. Вось і сяло Пебраддзе—цудоўнейшае месца: з аднаго боку падступае да яго вялікае возера Абстэрна, а з другога—Набіста, за сялом пачынаецца дрымучы лес. Дзяжурныя ўзяліся за прыгатаванне вячэры, некаторыя заняліся выпускам другога нумару насценгазеты, а я, Віктар і Мікола Скарабагатаў пайшлі ў вёску. Сустрэлі дзядулю, разгаварыліся. Мітрафан Нікіфаравіч Карцяновіч, сямідзесяцігадовы стары, запрасіў нас у хату.*

*Павольна апавядае Мітрафан Нікіфаравіч. Перад намі паўстае юнацтва бедняка, які прадае сваю рабочую сілу на рыжскай прыстані, каб дабыць кусок хлеба. Рэвалюцыю сустрэў ён на Пуцілаўскім заводзе. Галадоўка. Недабітыя буржуі хаваюць прадукты ў падвалах, а рабочы люд па картачках атрымлівае пяцьсот грамаў хлеба на дзень. Калі справы крыху наладзіліся, Карцяновіч вярнуўся ў роднае сяло. Але гора ізноў чакала яго: прыходзяць польскія паны, і Мітрафан Нікіфаравіч ізноў гне спіну на чужаземцаў. Азёры сталі панскія, і рыба ў іх—таксама панская.*

*У размову ўключаецца сын М. Н. Карцяновіча Уладзімір, які ў час вайны быў вывезен гітлераўцамі ў рабства. Яго ж малодшы брат і бацька пайшлі ў партызаны. Вёска, якая цяпер так дабротна забудавана, была дашчэнту спалена немцамі. Цяпер сям'я Карцяновічаў працуе ў калгасе. Калгас займаецца рыбнай лоўляй. Калі мы спыталі, колькі рыбы дае іх калгас, то Уладзімір усміхнуўся:*

*— Цэлымі тонамі ў нас вылаўліваецца рыба.*

*Тутэйшыя лясы багаты дзічынай. Тут водзяцца белкі, зайцы, яноты, ваўкі і нават ласі, а гады два назад у азёры завезлі баброў, і яны добра прыжыліся. Стары паляўнічы расказвае нам розныя здарэнні, паказвае шкуркі забітых ім звяроў, частуе моцным тутунём.*

*Даўно ўжо апусціўся змрок над лясным сялом, які праразае святло электрычных лямпачак, ужо абвясцілі па радые нарад на заўтра, ўжо чуюцца жарты моладзі на вуліцах, якая вяртаецца з кіно, а ў нас размова цячэ і цячэ...*

*30 студзеня.*

*Праводзім гутарку са школьнікамі. Вучні тут дружныя. У школе працуюць гурткі мастацкай самадзейнасці. Хор лічыцца адным з лепшых у раёне. Навучэнцы ўласнымі сіламі будуюць школьную майстэрню. Настае час развітання. Абменьваемся адрасамі са школьнікамі. Яны запрашаюць прыехаць да іх летам, калі вёска асабліва прыгожая, калі ў азёрах можна купацца, а ў лесе сабіраць грыбы і ягады. Праважаючы нас, яны доўга махаюць рукамі, жадаюць шчаслівай дарогі.*

*Наша васьмёрка выйшла за вёску. Сходзілася лютая завіруха. Каб скараціць адлегласць, рашылі ісці цераз возера, зайшлі на сярэдзіну, а берагоў не відаць. Завея аж з ног збівае. Вецер са страшэннай сілай нясе хмары снегу. Кругом бела: не відаць ні неба, ні зямлі—толькі лёд пад нагамі. Ісці на лыжах не магчыма, знімаем іх, па компасу выбіраем кірунак і прасоўваемся наперад.*

*Нарэшце, выйшлі на бераг. Ідзём лесам. Той не бачыў суровай прыгажосці, каму не даводзілася у час завірухі быць у лесе. Старыя дрэвы стогнуць. Дзесьці ў іх верхавінах гуляе вецер з шалёнай сілай. Час-ад-часу чуецца скрып і трэск галін. Усё гудзе, шуміць, бушуе. Вось яна, турысцкая рамантыка!*

*Усё часцей сустракаюцца азёры, пакрытыя лёдам. Уперадзе паказалася сяло Іказнь. Мясцовыя жыхары сказалі, што тут даўным-даўно жыў люты князь Сапега. Па віне і без віны казніў ён прыгонных. Нездарма людзі гаварылі аб сяленні, што тут «Сапега і казнь». Затым Сапега памёр, а назва засталася. Да гэтага часу захаваўся фундамент замка Сапегі. Як багата Беларусь мясцінамі, звязанымі з суровым мінулым! Тут кожным камень гаворыць пра гісторыю.*

*К вечару прыйшлі ў канечны пункт нашага маршрута горад Браслаў. Складваецца ўражанне, што ён размешчан на востраве: кругом азёры. Самае большае з іх возера Дрывяты, басейн якога займае звыш за 150 кв. км. Горад размешчан жывапісна: многа насаджэнняў, прыгожы стары парк, вуліцы мясцінамі падыходзяць да самай вады. Над горадам ўзвышаецца замкавая гара. На ёй працаўнікі Браслава ўзвялі помнік мясцоваму ўрачу Нарбурту, слаўнаму чалавеку, які працаваў тут у 20, 30-я гады і выратаваў жыццё не аднаму браслаўчаніну.*

*Мы спыніліся ў адным з пакояў школы. За вокнамі яшчэ гудзе завіруха. Як прыемна піць гарачую каву пасля такога цяжкага пераходу!*

*— Заўтра будзем у Мінску,—сказаў Валерый Пракошын.*

*— А неяк шкада раставацца з турысцкім жыццём,—зазначыў Мікола Скарабагатаў.*

*—За гэтыя дні так прывыклі адзін да аднаго, да новых месц, да перамены ўражанняў...*

*І крыху затужылі хлопцы. Пачалі ўспамінаць цёплыя сустрэчы, сардэчныя размовы, вясёлыя здарэнні. А вецер за вокнамі глуха шуміць і шуміць...*

*31 студзеня.*

*Паход заканчваецца. Мы яго прысвяцілі саракагоддзю ўніверсітэта. Пройдзена звыш 180 кіламетраў, норма на значок «Турыст СССР» выканана. Колькі ўражанняў, харошых знаёмстваў, а колькі цікавага мы даведаліся аб сваёй роднай рэспубліцы! Турызм не толькі цяжкі від спорту, але і прыемны адпачынак.*

*Раніцай садзімся у аўтобус, які ідзе на Мінск. Добры дзень, універсітэт!*

Рэдактар М. ЦІКОЦКІ.

НАШ АДРАС:
Мінск,
Універсітэцкі гарадок,
біякорпус, 31.
Тэлефон: 2-07-19.
Друкарня выдавецтва
БДУ імя У. І. Леніна.

АТ 02193. Зак. 835.